# ПСІХАЛОГІЯ

УДК 37.015.3

*С. А. Мяснiковiч*

## ВЕРБАЛІЗАВАНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ СТУДЭНТАЎ ПРА МАРАЛЬНАГА ЧАЛАВЕКА

Актыўнасць асобы ў працэсе маральнага развіцця праяўляецца не толькі ва ўменні самастойна адабраць тыя ці іншыя маральныя нормы і прынцыпы, унутрана прыняць іх, але і ў здольнасці самастойна аднаўляць такія нормы на аснове абагульнення ўласнага жыццёвага вопыту. Вялікую ролю ў гэтым адыгрывае разуменне і ўсведамленне маральных ведаў як неабходнай умовы для ўзнікнення адносін да маральных з'яў.

Дадзенае даследаванне было скіравана на выяўленне прататыпа маральнай асобы ў студэнцкім асяроддзі. Эксперымент складаўся з двух этапаў:

1. Падыспытныя ў выглядзе вольнага апісання характарызавалі маральнага чалавека, формы праяўлення ўласцівых яму якасцяў, вынікі маральных — амаральных паводзін. Затым пры дапамозе кантэнт-аналізу адказаў быў складзены бланк з дэскрыптарамі.

2. Падыспытныя ацэньвалі маральных людзей, якіх асабіста ведалі, літаратурныя персанажы, герояў тэатральных пастановак, кінаперсанажы па кожнаму са сцвярджэнняў пры дапамозе пяцібалавай шкалы. Яны называлі свой пол, узрост і ўзрост апісваемага чалавека.

Першае заданне прадугледжвала высвятленне імпліцытных канцэпцый адобраных — неадобраных грамадствам якасцяў, на аснове механізма абстрагавання, звязанага з прататыпам — канкрэтным вобразам, прадстаўніком некаторага класа. У гэтай сувязі падыспытным прапанавалася апісаць вядомых людзей, літаратурных герояў, кінаперсанажаў, пра якіх можна было б сказаць: «Гэта сапраўды маральны чалавек».

Другое заданне, пабудаванае ў выглядзе псіхалагічнай задачы, было скіравана на пошук сістэмаўтваральнай уласцівасці (не проста набору якасцяў), што дазваліла вызначыць апісваемую асобу як маральную. Прапанавалася прывесці апісанне сітуацыі, якая пацвярджала, што апісваемы чалавек — сапраўды маральная асоба.

Даследаванне праводзілася ў межах навучальнага эксперыменту па развіццю маральнай свядомасці студэнтаў пры дапамозе мастацкай перцэпцыі. Ставілася задача фарміравання ўяўленняў пра магчымыя матывы тых ці іншых маральных — амаральных учынкаў і маральных — амаральных паводзін у цэлым, раскрыццё ўсёй складанасці матываў, выяўленне іх іерархіі, дынамікі, сувязі з маральным развіццём асобы, усведамленне маральных каштоўнасцяў літаратурных персанажаў, кінагерояў і герояў тэатральных пастановак.

Тэарэтычнай асновай эксперыменту паслужылі ўстаноўленыя ў даследаваннях Л. М. Рожынай палажэнні, у прыватнасці, вывад аб тым, што абагульненыя і ўсвядомленыя маральныя каштоўнасці герояў мастацкага твора становяцца часткай індывідуальнага вопыту суб'екта і перабудоўваюць асэнсаванне гэтага вопыту, прыводзячы да актуалізацыі адных і ўзнікнення іншых асобасных сэнсаў рэцыпіента. Вынік гэтай своеасаблівай сэнсавай індукцыі — фарміраванне псіхалагічных абагульненняў, якія дэтэрмінуюць маральнае развіццё асобы [1].

Даследаванне было ўключана ў курс лекцыйных, семінарскіх і практычных заняткаў па агульнай, узроставай і педагагічнай псіхалогіі, практычных заняткаў па асновах псіхадыягностыкі, а таксама ў пазааўдыторную працу са студэнтамі факультэта рускай філалогіі БДПУ імя М. Танка.

Разгледзім вынікі апрацоўкі эмпірычных даных, атрыманых на першым этапе даследавання з удзелам студэнтаў 1—2 курсаў у колькасці 118 чалавек.

Кантэнт-аналіз эмпірычнага матэрыялу дазволіў выявіць пэўныя адрозненні ў вольным апісанні маральнага чалавека. Ва ўяўленні студэнтаў да правядзення эксперыменту **маральны чалавек:** дапамагае іншым (0,8), паважае іншых людзей (0,7), валодае высокімі разумовымі здольнасцямі (0,5), не ўжывае алкаголь і не курыць (0,42), не здраджвае ў цяжкую хвіліну (0,4), не парушае законаў (0,38), правільна выхаваны (0,27), разбіраецца ў людзях (0,18), паважае сябе (0,06). У адзінкавых адказах сустракаюцца меркаванні тыпу «ўсебакова развіты», «умее тактоўна адказаць на пытанне», «прыслухоўваецца да грамадскай думкі».

Атрыманыя даныя пацвярджаюць неглыбокае і ў значнай ступені неадэкватнае апісанне якасных характарыстык маральнага чалавека.

У адказах рэспандэнтаў найчасцей выкарыстоўваюцца абстрактныя характарыстыкі, у якіх не апісваецца канкрэтная якасць асобы, бедны слоўнік тэрмінаў, адсутнічаюць ацэначныя меркаванні, не вызначаецца магчымасць сітуацыйнага праяўлення маральных якасцяў.

Ва ўяўленні студэнтаў, якія навучаліся па эксперыментальнай праграме, **маральны чалавек**: бескарысліва дапамае (0,87), добры (0,84), паважае сябе ды іншых (0,73), адказны (0,7), сумленны (0,68), здольны любіць (0,65), умее даравацъ (0,45), горды (0,42), высакародны (0,4), духоўна багаты (0,35), мэтанакіраваны (0,3), чысты (0,27), адкрыты (0,2), надзейны (0,17), тактоўны (0,14), суперажывае (0,09).

Такім чынам, у працэсе эксперыментальнай працы значна змяніўся і абагаціўся вербальны эталон, які характарызуе маральнага чалавека. Падыспытныя ўжывалі сінестэзічныя азначэнні, выкарыстоўвалі псіхалагічную тэрміналогію: «адкрыты знешняму і ўнутранаму вопыту», «канструктыўна пераўтварае сябе і навакольную рэчаіснасць». У характарыстыцы маральнага чалавека прысутнічалі не толькі маральныя, але і валявыя, камунікатыўныя, эмацыянальныя і рэфлексіўныя якасці. Адказы студэнтаў дадзенай выбаркі ўтрымлівалі ацэначныя меркаванні, што выяўляла іх адносіны да апісваемага чалавека.

У далейшым вывучаліся вербалізаваныя ўяўленні пра формы праяўлення маральных якасцяў падыспытнымі да правядзення эксперыментальнай працы і ў працэсе эксперыменту. Даныя колькаснага аналізу прыведзены ў табліцы 1.

***Табліца 1***

**Формы праяўлення маральных якасцяў**

| № п/п | *Сэнсавыя адзінкі* | *Індэкс значнасці* | |
|---|---|---|---|
| | | *Выбарка да правядзення даследавання* | *Выбарка пасля правядзення даследавання* |
| 1 | Адносіны да іншых людзей | 0,55 | 0,92 |
| 2 | Адносіны да сябе | 0,13 | 0,86 |
| 3 | Жыццёвыя пазіцыі | - | 0,72 |
| 4 | Мэты | 0,04 | 0,7 |
| 5 | Сэнс жыцця | - | 0,67 |
| 6 | Учынкі, паводзіны | 0,62 | 0,67 |
| 7 | Адносіны да прыроды | - | 0,42 |
| 8 | Адносіны да справы, дзейнасці | 0,2 | 0,35 |
| 9 | Зносіны | 0,32 | 0,35 |
| 10 | Выкананне правілаў этыкету | 0,46 | 0,3 |
| 11 | Экстрэмальныя сітуацыі | 0,2 | 0,28 |
| 12 | Інтарэсы | - | 0,25 |
| 13 | Матывы | - | 0,25 |
| 14 | Афармленне знешнасці | 0,35 | 0,1 |

Даныя табліцы 1 пацвярджаюць пэўныя адрозненні ў змесце і іерархіі форм праяўлення маральных якасцяў. Калі ў выбарцы падыспытных да правядзення эксперыментальнага даследавання пераважаюць меркаванні, аднесеныя да катэгорый «учынкі, паводзіны», «выкананне правіл этыкету», «адносіны да іншых людзей», то ў выбарцы рэцыпіентаў у працэсе эксперыментальнай працы выяўлены іншыя даныя. Надаючы вялікае значэнне такім формам праяўлення маральных якасцяў, як адносіны да іншых людзей, дзеянні і ўчынкі, рэспандэнты вылучаюць значнасць тых, якія не заўсёды выяўлены вонкава, — адносіны да сябе, мэты. У дадзенай групе падыспытных з'яўляюцца катэгорыі: «жыццёвыя пазіцыі», «сэнс жыцця», «адносіны да прыроды», «інтарэсы», «матывы». Атрыманыя вынікі характарызуюць абагачэнне і паглыбленне ўяўленняў пра формы праяўлення маральных якасцяў.

Разгледзім вынікі маральных — амаральных паводзін.

*Табліца 2*

**Індэкс значнасці сэнсавых адзінак у апісаннях вынікаў маральных паводзін**

| № п/п | Сэнсавыя адзінкі | Індэкс значнасці | |
|---|---|---|---|
| | | *Выбарка да правядзення даследавання* | *Выбарка пасля правядзення даследавання* |
| 1 | Узаемаразуменне | 0,8 | 0,86 |
| 2 | Сяброўскія адносіны | 0,7 | 0,85 |
| 3 | Самаўдасканаленне | 0,15 | 0,78 |
| 4 | Самапавага | | 0,76 |
| 5 | Любоў усіх, хто акружае | 0,22 | 0,72 |
| 6 | Адчуванне ўнутранага задавальнення | 0,12 | 0,65 |
| 7 | Дасягненне мэты | 0,24 | 0,58 |
| 8 | Павага да іншых людзей | 0,32 | 0,54 |
| 9 | Магчымасць і права маральнага выхавання дзяцей | 0,12 | 0,4 |

З табліцы вынікае, што ў апісаннях падыспытных у ходзе эксперыментальнага даследавання індэксы значнасці большай часткі катэгорый вышэй, чым у апісаннях да яго правядзення. З'яўляецца новая катэгорыя «самапавага». Па катэгорыях «самаўдасканаленне і адчуванне ўнутранага задавальнення» назіраецца значнае павелічэнне індэкса значнасці. Аднак асноўнае адрозненне заключана ў эмпірычных індыкатарах кожнай з катэгорый. Так, катэгорыя «ўзаемаразуменне» ў студэнтаў да экспе-

рыментальнага даследавання абмяжоўваецца, у асноўным, меркаваннямі тыпу «ўзаемаразуменне з тымі, хто акружае», «разуменне з боку іншых людзей». Дадзеная катэгорыя ўключае і выказванні падыспытных у ходзе эксперыментальнага даследавання: «маральныя паводзіны выклікаюць шчырую падтрымку і ўхваленне іншых людзей», «чалавек адчувае адзінства са светам», «разам з сімпатыяй прысутнічае здзіўленне з боку тых, хто нас акружае, выклікане тым, што зараз вельмі мала робіцца сапраўды бескарыслівых учынкаў».

Параўнаем даныя вынікаў амаральных паводзін. У абедзвюх выбарках часта называюцца: канфлікты з іншымі людзьмі (0,5; 0,6), адзінота (0,32; 0,48), расчараванне ў жыцці (0,25; 0,34), незадавальненне іншымі людзьмі (0,48; 0,3), пакута (0,37; 0,78), страта сяброў (0,4; 0,56), дэградацыя, самаразбурэнне (0,1; 0,25).

У выбарцы студэнтаў, якія навучаліся па эксперыментальнай праграме, дыяпазон пералічаных вынікаў шырэйшы і больш багаты: непакой, нездавальненне сабой, душэўная пустата, агрэсія, трывога, дыскамфорт, цяжар на сэрцы, самаасуджэнне, зніжэнне самаацэнкі, душэўны боль, змрочны настрой, фізічнае напружанне, разгубленасць і г. д.

Такім чынам, параўнанне вынікаў, атрыманых да і пасля эксперыментальнага даследавання, дазваляе зрабіць вывад аб значных зменах ва ўяўленнях студэнтаў, характарызуючых іх маральную сферу.

## *ЛІТАРАТУРА*

1. *Рожина Л. Н.* Художественное познание человека читателями-школьниками. Мн., 1993.

2. *Рожина Л. Н.* Развитие эмоционального мира личности. Мн., 1999.

3. *Рожина Л. Н.* Развивающие технологии обучения студентов //Псіхалогія. 2000. № 3. С. 32—49.

## *SUMMARY*

*The article presents approaches to the problem of development of moral. Results of educating experiment are given in the article on the develompent of moral.*